# Білет 6

## Практычнае заданне.
## Грамадска-палітычнае жыццё ў БССР у другой палове 1940-х – 1980-ыя гг.

**Выкарыстоўваючы прадстаўленыя матэрыялы, адкажыце на пытанні (выканайце заданні):**

1. У якім годзе быў зацверджаны Дзяржаўны сцяг БССР?
2. Якую ролю іграла Камуністычная партыя ў грамадска-палітычным жыцці БССР у другой палове 1970-х – 1980-ыя гг.?
3. Назавіце формы ўдзелу грамадзян БССР у грамадска-палітычным жыцці краіны, кіраванні дзяржавай. Пацвердзіце сваё меркаванне цытатамі з прадстаўленых матэрыялаў.
4. Якія асаблівасці гістарычнага шляху беларускага народа і грамадска-палітычнага жыцця краіны ўвасобіліся ў Дзяржаўных сімвалах БССР?

### І. Дзяржаўныя сімвалы БССР

| Дзяржаўны сцяг БССР у 1951—1991 гг. | Фрагмент Дзяржаўнага гімна БССР (1955–1991 гг.)<br>Сл. М. Клімковіча, муз. Н. Сакалоўскага |
|---|---|
|  | Мы, беларусы, з братняю Руссю<br>Разам шукалі к шчасцю дарог.<br>У бітвах за волю, у бітвах за долю<br>З ёй здабылі мы сцяг перамог!<br><br>Нас аб’яднала Леніна імя,<br>Партыя к шчасцю вядзе нас у паход.<br>Партыі слава! Слава Радзіме!<br>Слава табе, беларускі народ! |

### ІІ. З Канстытуцыі БССР (1978 г.)

Артыкул 1. Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка ёсць сацыялістычная агульнанародная дзяржава, якая выражае волю і інтарэсы рабочых, сялян і інтэлігенцыі, працоўных рэспублікі ўсіх нацыянальнасцей.

Артыкул 2. Уся ўлада ў Беларускай ССР належыць народу. Народ ажыццяўляе дзяржаўную ўладу праз Саветы народных дэпутатаў, якія складаюць палітычную аснову Беларускай ССР.

Артыкул 6. Кіруючай і накіроўваючай сілай савецкага грамадства, ядром яго палітычнай сістэмы, дзяржаўных і грамадскіх арганізацый з’яўляецца Камуністычная партыя Савецкага Саюза. […].

Узброеная марксісцка-ленінскім вучэннем, Камуністычная партыя вызначае генеральную перспектыву развіцця грамадства, лінію ўнутранай і знешняй палітыкі СССР; кіруе вялікай стваральнай дзейнасцю савецкага народа, надае

планамерны, навукова абгрунтаваны характар яго барацьбе за перамогу камунізму.

Артыкул 7. Прафесійныя саюзы, Усесаюзны Ленінскі Камуністычны Саюз Моладзі, кааператыўныя і іншыя грамадскія арганізацыі ў адпаведнасці са сваімі ўстаўнымі задачамі ўдзельнічаюць у кіраванні дзяржаўнымі і грамадскімі справамі, у рашэнні палітычных, гаспадарчых і сацыяльна-культурных пытанняў.

Артыкул 97. Вышэйшым пастаянна дзеючым органам дзяржаўнай улады Беларускай ССР з'яўляецца Вярхоўны Савет Беларускай ССР.

Артыкул 115. Савет Міністраў Беларускай ССР – Урад Беларускай ССР – з'яўляецца вышэйшым выканаўчым і распарадчым органам дзяржаўнай улады Беларускай ССР.

Артыкул 124. Органамі дзяржаўнай улады ў абласцях, раёнах, гарадах, раёнах у гарадах, пасёлках, сельскіх населеных пунктах з'яўляюцца адпаведныя Саветы народных дэпутатаў.

**III. З даклада П.М. Машэрава на нечарговай дзявятай сесіі Вярхоўнага Савета БССР (1978 г.)**

«З першага і да апошняга дня гэтай важнай палітычнай кампаніі працаўнікі гарадоў і сёл праявілі высокую актыўнасць, сапраўдную зацікаўленасць у тым, каб Асноўны Закон БССР (1978 г.) абвяшчаў і замацоўваў усе найбольш істотныя і важныя бакі нашых дасягненняў і здабыткаў у брацкай сям'і савецкіх народаў, забяспечваў новыя магчымасці для эканамічнага і сацыяльнага прагрэсу рэспублікі.

Усяго было праведзена больш за 70 тыс. нарад, у якіх прыняло ўдзел каля 6 млн. чал. Пры абмеркаванні праекта выступіла звыш 327 тыс. чал. Яны ўнеслі больш за 330 тыс. прапаноў і заўваг…».